Айконімы Шаняўскога сельскага савета: гісторыя паходжання

Паводле дадзеных, у сельсавет уключана 18 вёсак і хутар Квасаўшчына: Гарадзечна, Жабін, Засімавічы, Засімы, Клятное, Козі Брод, Кацёлкі, Лібія, Паддубна, Прылутчына, Сярэдняе, Сасноўка, Харкі, Хомна, Чахец, Шакуны, Шані, Шубічы.

Легенда пра паходжанне назвы вёскі Гарадзечна (Городзечно).

Было гэта даўным-даўно, яшчэ нават і бацькоў маіх не было на свеце. Мястэчка было невялікае, пражывала 25 чалавек. Але чамусьці яны не ладзілі паміж сабой. Справа ў тым, што Гарадзечна славілася сваімі землямі. А людзі былі зайздросныя і кожнаму хацелася мець чым больш урадлівых прастораў. Так і пачаліся спрэчкі. Доўга не было парадку ў гэтай вёсцы, пакуль аднойчы не з'явіўся цар Гарадзей. Гэта быў прыгожы, магутны і славуты чалавек. Даведаўся ён пра мясцовыя спрэчкі і вырашыў навесці парадакі. Цар Гарадзей падзяліў землі паміж людзьмі і даў дазвол на іх карыстанне. Людзі ўзрадаваліся і пачалі жыць мірна. Вяскоўцы дзякавалі цару Гарадзею за шчасце і багацце.У імя яго яны нават назвалі вёску Гарадзейна. Але з часам назвы змяняліся. І стала проста Гарадзечна.

Жабін. Людзі пасяліліся ў прыродным кутку каля невялікага стаўка, балотца, багатага на жаб і жабурэнне (мясцовая назва раскі). Месца было прыдатным для гадоўлі качак і гусей.

Засімы, Засімавічы (Засімовічы). Ад імя Зосім – святога ахоўніка пчол (2 ліпеня), які, як лічыцца, разам з братам першым прынёс іх на славянскія землі.

Кацёлкі (Коцёлкі). У аснову назвы пакладзена слова "каціцца" – ехаць, перамяшчацца. Магчыма, паселішча заснавана людзьмі, якія здалёк прыкаціліся-дабраліся сюды. Кацёлкамі яшчэ называлі драўляныя колы, з якімі гулялі дзеці дзеля забавы.

А вось што расказвала жыхарка вёскі Каўшыла Кацярына Піліпаўна. Аднойчы ехаў рамеснік са сваёй сям'ёй. Хутчэй за ўсё ад каго-небудзь ці ад чагосьці ўцякаў, так як вёз з сабой сваю маёмасць. Ды і дарога была не з лёгкіх: вакол абступаў вялікі, месцамі забалочаны лес. І калі конь ўжо выбіваўся з сіл, рамеснік заўважыў сярод лесу паляну. Гэта быў груд, які ўзвышаўся над навакольнаю мясцовасцю. Тут рамеснік спыніўся адпачыць, ды і застаўся жыць. Ён займаўся вытворчасцю рознага посуду: лыжак, місак, гаршкоў і вялікіх катлоў. З часам каля рамесніка сталі сяліцца іншыя людзі, якія ўступалі з іншымі селішчамі ў гандлёвыя адносіны. Відавочна, што асаблівым попытам карысталіся катлы, ад назвы якіх і пайшла назва вёскі. З часам Катлы перайменаваліся ў Кацялкі – Кацёлкі.

„Ой, даўно гэто было. Я родзіласа ў дзеватнаццатым годзе, то ўжэ село так называлосо. Яшчэ старэйшые за мэне людзі казалі, шо пры цары тут котлы робілі, варылі. Можэ, так воно і е: котлы – коцелок – Коцелкі. А яшчэ говорат, шо война якаясь была, то людзі елі з коцелкоў. Так і посённішні дзень называемса Коцёлкамі, а людзі – коцёлкоўскімі. Говорат: хлопцы і дзеўчата коцёлкоўскіе

ідут. Спэрша нашэ село не такое было. З одного боку хаты былі, а з другого – хлевы стоялі. Вымірае село, німа кому жыці, осталіса одны старые, – перажывае Кацярына Піліпаўна, але з усмешкаю дадае: – Добрэ, шо дзеці і ўнукі проведвают. Зарэ ў нас прыежджых много, дачы купляют. Гэта гуліца, дзе мы жывэм, „старая” называецца, а за магазіном – „новая”, там много новых домікоў настроілі. Осталосо мало людзей старых, усе поўміралі, але добрэ, шо молодые ворочаюцца ў село”. На жаль, Кацярына Піліпаўна памерла, пражыўшы 101 год.

У Кацёлках нарадзіўся вядомы дзеяч беларускай культуры, танцоўшчык, балетмайстар, збіральнік беларускага харэаграфічнага фальклору Іван Маркавіч Хвораст .

Клятное (Клетное). Паселішча з’явілася ад некаторых жыхароў, што маглі “клясці”, “ведзьмаваць”. Некаторыя лічаць ад слова”клець” – свіран, што будаваўся ў двары для захавання прадуктаў ці ад “клечанне” – зеляніна, якой упрыгожваюць хату на Сёмуху.

Лібія. Паходзіць ад лацінскага “лібер” – свабода. Вольнае месца, дзе можна было пасяліцца ці ад слова “лібіла” – завостраная палка, на канцы якой падвешвалі мяса жабы, малюскаў, каб падманіць ракаў.

Паддубна (Поддубно). Месца пад дубамі, каля дубоў, каля якіх пабудаваліся людзі.

Прылутчына. Паселішча каля лукі – рачнога дугападобнага выгіну, рачнога калена.

Сасноўка (Сосноўка). Паселішча сярод хвойных парод дрэў, у сасняку.

Сярэдняе (Серэднее). Назва адлюстроўвае прасторавае месцазнаходжанне – у сярэдзіне нечага.

Харкі. Мясціны, дзе вадзіліся харкі – невялікія драпежнікі з каштоўным футрам.

Хомна (Хомнэ). Назва ўтворана ад мужчынскага імя Фама, па-беларуску Хама ці kiminas – “мох”.

Чахец (Чахоч). “Чахча, чахец” – рэдкі пералесак з крывых сасонак на пясчаных узгорках. Другі варыянт: ад нецаркоўнага імя Чох, цяпер забытага. Або: назва носіць негатыўную адзнаку месца паселішча – месца, дзе жыў кволы, хворы чалавек ці ўсё дрэннае расло, чахла.

Шакуны (Шакуны). Ад беларускага прозвішча Шакута, якое генетычна паходзіць ад літоўскіх каранёў. Яшчэ адна версія: ад слова “шыкоўны” – хараство хат, будынкаў, вуліцы.

Шакуны – радзіма Рыгора Раманавіча Шырмы, беларускага харавога дырыжора, фалькларыста, грамадскага і музычнага дзеяча, публіцыста, літаратуразнаўцы (дадатак 3).

Шані (Шэні). Назва ўзнікла ад слова “шанец” – часовае земляное палявое ўмацаванне, акоп, траншэя. У мове мясцовага насельніцтва магло з’явіцца ў 15-17 стагоддзях. Другі варыянт: Ад слова “шанок” – мера сыпучых рэчываў. На рускіх картах пачатку 20 стагоддзя вёска Шані пазначана як “Шенье”.

У Шанях нарадзіўся Мікола Засім, беларускі паэт (дадатак 4).

Шубічы (Шубічы) Паселішча ўзнікла ад віду вопраткі. Кушняры і аўчыннікі выраблялі футру – аўчыну. З аўчыны краўцы шылі кажухі, шубы, паўшубкі свабоднага пакрою.

У Шубічах нарадзіўся савецкі ваеннаначальнік, генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза Сяргей Антонавіч Бабрук.